# Весці

**_Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта_**

**1996 № 3 (9)**

Часопіс выдаецца з чэрвеня 1994 г.
Выходзіць чатыры разы ў год


## Змест

### Педагогіка


*Ціханаў Л. М., Грымаць А. А.* Дынаміка творчага і традыцыйнага пачаткаў у працэсе фарміравання прафесіяналізму дзейнасці педагога ........ 3

*Вадзінскі Д. І.* Навуковы факт у педагагічным даследаванні ........ 9

*Камінская С. А.* Прафесійныя каштоўнасці педагагічнай дзейнасці ........ 16

*Васілеўскі А. Б.* Змест і структура геаметрычных практыкаванняў для рэалізацыі ідэі фузіянізму ........ 21

*Бабарнёва Д. К., Ефімчык А. А.* Арганізацыя працы студэнта на практычных занятках ........ 28

*Паўлоўскі А. І., Пупцаў А. Я.* Арганізацыя выніковага кантролю ведаў і ўменняў вучняў на ўроках інфарматыкі ........ 34

*Кунцэвіч В. М.* Удасканаленне музычна-інструментальнай падрыхтоўкі студэнтаў ........ 43


### Гісторыя


*Сурта А. М.* Франкская экспансія і хрысціянізацыя Германіі ........ 48


### Мовазнаўства


*Груцо А. П.* Функционирование образований, восходящих к праславянским **orz+*pęti* в белорусском языке ........ 55



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

УДК 281

*А. М. Сурта*

# Франкская экспансія і хрысціянізацыя Германіі

Германія ў параўнанні з былым Рымскім Захадам (Італіяй, Галіяй, Іспаніяй, Брытаніяй) дастаткова позна, толькі ў VI—VIII ст. уключылася ў паэтапны і доўгачасовы працэс хрысціянізацыі. На працягу гэтых стагоддзяў франкі падпарадкавалі амаль усю тэрыторыю Германіі, якая ўвайшла ў склад франкскай дзяржавы.

Да пачатку франкскага заваявання ў VI ст. практычна ўся зарэйнская Германія заставалася язычніцкай. Але адзначым важную акалічнасць: у прырэйнскім і прыдунайскім рэгіёнах (раёнах рассялення алеманаў і бавараў) хрысціянства і царква валодалі значным уплывам ужо ў позняй фазе рымскага панавання (хаця, магчыма, гэта была хрысціянская вера ў яе арыянскім варыянце). Даказана, што хрысціянскае насельніцтва там ніколі не знікала цалкам, і хрысціянскія культавыя месцы, як і астаткі царкоўнай арганізацыі, перажылі час перасялення народаў [1, с. 254]. Гэты важны фактар спрыяў распаўсюджванню хрысціянскай рэлігіі і фарміраванню значнай царкоўнай арганізацыі ў ходзе працэсу феадалізацыі ў Баварыі і Алеманіі, якія вельмі рана, у пачатку VI ст., увайшлі ў склад франкскай Меравінгскай дзяржавы.

У VI-VIII ст. франкскія каралі і маёрдомы спалучалі палітычную экспансію ва ўсходне-рэйнскія германскія вобласці з



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

місіянерскімі акцыямі сярод язычніцкіх пляменаў, якія ажыццяўляліся часцей за ўсё ў VI-VII ст. ірландскімі манахамі і іх франкскімі паслядоўнікамі. Аднак розныя германскія вобласці і племянныя саюзы ўцягваліся ў арбіту хрысціянізацыі ахвотным або насільным шляхам у розны час, з рознай ступенню паспяховасці.

Працэс стварэння царкоўнай арганізацыі ў бавараў, алеманаў, цюрынгаў і саксаў меў спецыфічныя асаблівасці, што было звязана як з эвалюцыяй сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў унутры кожнага з племянных саюзаў, так і са знешнімі ўмовамі іх фарміравання, менавіта з франкскім уплывам.

Сярод алеманаў хрысціянізацыя, якая пачалася ў канцы VI ст., праводзілася ў асноўным кляштарамі Бургундыі на чале з Люксельскім. У Эльзасе дзейнічалі ірландскія манахі: Калумбан, Гал, Фрыдалін, Тродперт [2]. Місіянерскія акцыі сярод бавараў у VII ст. здзяйсняліся таксама ірландскімі і франкскімі манахамі Еўстазіем, Агілам і Агрэсціем, якія былі запрошаны баварскімі князямі Агілафінгамі з таго ж Люксельскага кляштара [3].

Дыферэнцыяцыя грамадства, якая адбывалася на працягу VI-VIII ст., прывяла ў пачатку VII ст. да фарміравання кантрастнай і сацыяльнай структуры ў бавараў і алеманаў і суправаджалася змяненнямі ў ідэйнай сферы. Сацыяльныя групы, якія пераўтвараліся ў ходзе працэсу расслаення грамадскіх груповак яшчэ радавога характару ў адзіны пануючы пласт, усё больш адасабляліся ад масы насельніцтва ў сваіх духоўна-рэлігійных уяўленнях. Вядучыя групы знаці, і ў першую чаргу герцагскія сем'і, рана ўстанавілі прамыя сувязі з хрысціянскай царквой, падтрымлівалі місіянераў, якія прыйшлі ў іх вобласці з іншых краін (Аўстразіі і Бургундыі), садзейнічалі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фарміраванню царкоўнай арганізацыі. Пры гэтым іх інтарэсы супадалі з інтарэсамі франкска-меравінгскай арыстакратыі, якая імкнулася да пашырэння і інтэнсіфікацыі свайго ўплыву ў Германіі. Таму на раннім этапе імкненні алеманскіх і баварскіх герцагстваў атрымалі адпаведную рэакцыю франкскай знаці і звязаных з ёю царкоўных сіл. Нягледзячы на зусім малую колькасць звестак аб гэтым перыядзе, вядомы факты, што пацвярджаюць падобныя сувязі. Так, алеманскі герцаг Кунца прымаў удзел у арганізацыі франкскім каралём Дагабертам I (629—639) епіскапства ў Канстанцы, якое стала ў VII ст. уплывовым не толькі ў Алеманіі, але і далёка за яе межамі [4]. Хутка набыў уплыў і заснаваны ў Баварыі ў пачатку VII ст. кляштар Вельтэнбург.

У другой палове VII ст. практычна ўся раннефеадальная знаць алемана-баварскай прасторы хрысціянізавалася і пачала будаваць у сваіх уладаннях адасобленыя ад астатняга насельніцтва цэрквы, пры якіх хавала сваіх нябожчыкаў. Падкрэслім: нягледзячы на адносны поспех хрысціянізацыі ў Баварыі і Алеманіі, ахапіўшай у асноўным верхнія пласты грамадства, у VII ст. тут узніклі стабільныя і ўстойлівыя асновы царкоўнай арганізацыі. Да пачатку VIII ст. хрысціянская рэлігія і царква трывала і глыбока ўкараніліся на гэтай тэрыторыі, таму іх існаванне больш не магло падвяргацца ніякай апаснасці. Каля 715 г. у Алеманіі побач з Канстанцкім існавалі епіскапствы ў Аўгсбурзе, Базелі, Страсбурзе; з заснаваннем св. Галам манаскай келлі ўзнік кляштар Сант-Гален, а ў 724 г. пры ўдзеле св. Пірміна былі адкрыты манастыры Хорнбах і Райхенау на Бодэнскім возеры, якія сталі ў далейшым найбольш уплывовымі манаскімі арганізацыямі Каралінгскай імперыі [5].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У Баварыі ў гэты перыяд былі заснаваны кляштары Фрайзінг і Сант-Эмеран, што ў Рэгенсбурзе, якія адыгралі значную ролю ў гісторыі франкскай і раннефеадальнай нямецкай дзяржавы. Кляштары сталі канкурэнтамі епіскапскай арганізацыі ў сферы хрысціянскага місіянерства.

Ажыццяўленне ў першай палове VII ст. франкскіх місій на сярэднім Рэйне і ў фрызаў не мела значных поспехаў. Дамінаванне ў VII ст. ва ўсходне-рэйнскім рэгіёне сярод місіянераў выхадцаў з франкскіх калумбанаўскіх кляштараў з іх спецыфічнымі традыцыямі свабоды і незалежнасці ўскладняла фарміраванне царкоўнай арганізацыі па прыкладу кантынентальнай. Кантакты ірландскіх манахаў, выхадцаў з калумбанаўскіх кляштараў, былі нязначнымі як з франкскімі царкоўнымі цэнтрамі, так і з рымскай кафедрай [6].

Новыя тэндэнцыі ў працэс хрысціянізацыі германскіх народаў у канцы VII — пачатку VIII ст. прынесла дзейнасць англа-саксонскіх і франкскіх бенедыкцінскіх манахаў пры актыўнай падтрымцы аўстразійскіх маёрдомаў і папства. Адной з першых місій была акцыя, пачатая ў Фрызіі саксонскім манахам Вілібрордам і яго дванаццаццю спадарожнікамі-манахамі. Гэту акцыю пратэжыравалі Піпін Герыстальскі і Карл Мартэл, а кіраўніцтва і кантроль ажыццяўляў папа [7]. Наконт вынікаў гэтай місіі ў даследчай літаратуры існуюць розныя меркаванні: адны лічаць яе дастаткова паспяховай [8], іншыя — наадварот [9]. На наш погляд, місія Віліброрда ў цэлым стварыла першапачатковую базу для далейшай дзейнасці бенедыкцінскага манаства ў сферы хрысціянізацыі Зарэйнскай Германіі.

Прадоўжыў справу Віліброрда Баніфацый (каля 675—754), адзін са славутых англа-саксонскіх манахаў, якія дзейнічалі ў франкскай дзяржаве ў першай палове VIII ст. Ён заснаваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

некалькі кляштараў у Цюрынгіі, у тым ліку знакаміты Фульдскі — першы бенедыкцінскі кляштар на нямецкіх землях [10].

Арганізацыйнае згуртаванне і ўпарадкаванне місіянерства ў Цюрынгіі дзякуючы Баніфацыю стала перадумовай у культурным пераўтварэнні гэтага рэгіёну. Ужо на працягу VI—VII ст., асабліва ў час праўлення франка па паходжанні герцага Радульфа (першая палова VII ст.), тут рабіліся спробы хрысціянізацыі, якія ініцыянаваліся палітычным ядром Меравінгскай дзяржавы. Каля 700 г. адна частка цюрынгаў, перш за ўсё вышэйшыя сацыяльныя пласты, прынялі хрысціянства, другая яго не прымала і была настроена варожа. З пісьма папы Грыгорыя II (715-731) ад 722 г. відавочна, што ў пачатку VIII ст. яшчэ існавалі глыбокія супярэчнасці паміж хрысціянамі і нехрысціянамі [1, с. 255-257]. У гэты перыяд у Цюрынгіі адсутнічалі важнейшыя перадумовы эканамічнай, палітычнай і ідэалагічнай дзейнасці царквы у адрозненне ад Алеманіі і Бавары, дзе такія прадпасылкі ўжо сфарміраваліся. У цюрынгаў не было ні епіскапстваў, ні кляштараў, а ўзнікаўшыя Pfarrkirchen ствараліся пераважна малаадукаваным духавенствам, недастатков знаёмым з царкоўным вучэннем. Слабасць царквы, яе нязначная дзейнасць, якую яна процістаўляла нехрысціянскім рэлігійным уяўленням, прымушала цюрынгскіх герцагаў з роду Вюрцбургаў запрашаць місіянераў і царкоўных саноўнікаў з іншых мясцовасцяў для правядзення хрысціянізацыі. Так, цюрынгскі герцаг Хедэн падараваў Віліброрду ў 704—716 гг. значныя зямельныя ўладанні, у тым ліку крэпасць Мюльбург [11].

Няўдалымі ў Меравінгскі перыяд для франкскай дзяржавы аказаліся спробы хрысціянізацыі саксаў. На рубяжы VII-VIII ст. у саксаў, у адрозненне ад бавараў і алеманаў, не было спадчыннага герцагства. Толькі на перыяд вайны саксонскі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

племянны саюз, які складаўся з чатырох плямёнаў, выбіраў сабе правадыра [12]. Незвычайна жывучым рода-племянным формам грамадскай арганізацыі адпавядалі і рэлігійныя ўяўленні саксаў. Большасць членаў саксонскага племяннога саюза прытрымліваліся старажытных язычніцкіх рэлігійна-культурных поглядаў: пакланяліся ў святых гаях драўляным калонам-сімвалам сусветнай сілы, якая падтрымлівала космас. Хрысціянская царква ў саксаў не валодала ў той перыяд вартым упамінання ўплывам. Больш таго, усякія спробы хрысціянізацыі выклікалі ў іх упартае супраціўленне, аб сіле якога сведчыць лёс двух місіянераў, белага і чорнага Эвальдаў, якія каля 700 г. прыйшлі да саксаў і былі забіты яшчэ да пачатку сваёй місіянерскай дзейнасці [1, с. 255]. Толькі ў другой палове VIII ст. уладарнай рукой Карла Вялікага саксы прымусова былі схілены да новай веры.

Такім чынам, хрысціянізацыя ў Германіі была важнейшым фактарам меравінгскай, затым каралінгскай экспансій і працэсаў феадалізацыі ва ўсходне-рэйнскіх абласцях. Рэлігійная і палітычная экспансіі франкскай дзяржавы, манаскія місіянерскія акцыі ў гэтым рэгіёне, заснаванне кляштараў і фарміраванне царкоўнай арганізацыі садзейнічалі ўсталяванню трывалых сувязяў і залежнасці гэтых тэрыторый у свецкай і царкоўнай сферы як ад дзяржавы франкаў, так і ад рымскага прастола.

Адзначым: у германскіх усходне-рэйнскіх абласцях найбольш схільнай да хрысціянства аказалася мясцовая рода-племянная знаць, якая бачыла ў ім сродак палітычнага панавання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЛІТАРАТУРА


1. Deutsche Geschichte. Berlin, 1982. Bd. 1.
2. Vita Galli // MGH. SRM. Hannoverae, 1897. T. 4. P. 229-337; VITA FRIDOLINI // MGH. SRM. Hannoverae, 1892. T. 3. P. 350-369; Passio Trodperti // Ibidem. P. 28-30; Historia cosciola. 600-1500. Warszawa, 1988. T. 2. S. 479; The Penguin Dictionary of Saints. Harndsworth, 1983. P. 92, 143.
3. Katolicyzm wczesnosredniowieczny. Warszawa, 1973. S. 34; Zöllner E. Die Herkunft der Agelolfinger // Mitteilungen des Institutes für Österreichische Geschichtforschung. 59, 1951. S. 245-264.
4. Prinz F. Frühes Mönchtum in Südwestdeutschland und die Anfänge der Reichenau Entwicklungslinien und Forschungsprobleme // Mönchtum und Gesellschaft im Frühmittelalter. Darmstadt, 1976. S. 167.
5. Frank K. S. Gerchichte des christlichen Mönchtums. Darmstadt, 1993. S. 57.
6. Feine H. F. Kirchliche Rechtgeschichte. Weimar, 1955. Bd. 1. S. 201.
7. The Penguin Dictionary of Saints. P. 332-333.
8. Piatek T., Piatek J. Starokatolicyzm. Warszawa, 1987. S. 8.
9. Haller J. Das Papsttum. Idee und Wirklichkeit. Basel, 1951. Bd. 1. S. 390-391; Katolicyzm wczesnosredniowieczny. S. 35.
10. Bonifacius et Lulli epistola. Epist. 12, 16 // MGH. Epist. sel. Berolini, 1955. T. 1. P. 17-18, 28-29; Franzen A. Kleine Kirchengeschichte. Freiburg-Basel-Wien 1975. S. 137.
11. Geschichte Thüringens. Köln-Graz, 1968. Bd. 1. S. 372-374.
12. Vita Lebuini // MGH. SS. Leipzig, 1934. Bd. 30, 2. S. 793.


## SUMMARY


*The impact of Franks state on converting to Christianity of Germany, the specific features of the spread of new religions of different tribe unities, the links of converting to Christianity with the processes of feudalization in beyond Reine Germans from the 6th till the middle of the 8th century are being investigated in this article.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ